**Стымулюючы занятак у VII “А”класе 25.10.2021**

**Лады дзеяслова (абвесны, умоўны і загадны)**

**Мэта:** дапамагчы вучням асэнсаваць граматычнае значэнне ладу дзеяслова, падагульніць і сістэматызаваць веды вучняў пра значэнне, утварэнне і асаблівасці ўжывання дзеясловаў абвеснага, умоўнага ладу; удасканальваць уменні вызначаць дзеясловы абвеснага, умоўнага ладу ў тэксце, даваць ім характарыстыку, правільна ўжываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні; развіваць мысленне, памяць, арфаграфічную пільнасць вучняў; выхоўваць старанныя, добрасумленныя адносіны да працы.

**Абсталяванне:** карткі-заданні вучням.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант**

**II. Арфаграфічная хвілінка «Правапіс дзеясловаў з суфіксамі - ава- (-ява-), -іва- (-ыва-), -ва-, -оўва- (ёўва-)»**

- Утварыце дзеясловы незакончанага трывання пры дапамозе суфіксаў -ва-, -іва- (-ыва-).

Вымыць, выпісаць, падстрэліць, прыварыць, выкасіць, адкалоць, праветрыць, замасліць, расклеіць, перакуліць.

***Гульня “Карэктар”***

- Выпраўце памылкі ў няправільна напісаных словах і запішыце словы правільна.

Падваіваць рахунак, даказываць сябру, даследваць праблему, абклейваць сцены, паказываць кнігу, праветраваць пакой, расказваць казку.

**III. Паведамленне тэмы і мэты ўрока**

- Тэма нашага ўрока: «Лады дзеяслова». Зыходзячы з тэмы ўрока, паспрабуйце сфармуляваць мэту ўрока, прадоўжыце наступныя выразы:

- падагульніць веды пра … лады дзеясловаў
- вызначаць … лады дзеясловаў
- правільна ўжываць … ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні

(Пры неабходнасці настаўнік дапамагае).

**IV. Вывучэнне матэрыялу**

***1)*** Разгледзьце схему.

- Адкажыце на пытанні:

1. Якія дзеянні абазначаюць дзеясловы абвеснага ладу?
2. Як змяняюцца дзеясловы абвеснага ладу?
3. Якія дзеянні абазначаюць дзеясловы ўмоўнага і загаднага ладу? Як утвараюцца?

**Лад дзеяслова**

| | | |
|---|---|---|
| ***Абвесны лад*** | Дзеянне успрымаецца як рэальнае, якое адбываецца, адбывалася ці будзе адбывацца | падносім, гаворым;<br>падносіў, гаварыў;<br>буду падносіць, буду гаварыць |
| ***Умоўны лад*** | Дзеянне ўспрымаецца як магчымае, можа адбывацца пры пэўнай умове | падносілі б, гаварылі б;<br>падносіў бы, гаварыў бы |
| ***Загадны лад*** | Служыць не толькі для выражэння загаду, але і для іншых формаў пабуджэння: просьбы, пажадання, закліку | мыйце, ляжы, давай сходзім, няхай квітнее |

**3)** Размяркуйце дзеясловы ў графы табліцы.

Сустракаем, гаварыў бы, жуйце, пайшоў, убачыў бы, раю, зразумеў, параслі, біцеся, намоклі, радаваўся б, супакоіў, рассмяшыў бы, сходзі, запісаў, патлумачыла.

**V. Замацаванне матэрыялу**

***1) Работа з тэкстам.***

Прачытайце. Дайце тэксту назву. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Дзеясловы якога ладу пераважаюць у тэксце?

Пазычу кол..ры ў в..сёлкі,
Ц..пло пазычу у агн.. .
Пасля ў прынёманск..м пасёлк..
Закалыхаю цішыню.
Закалыхаю песняй новай,
Пра..дуся па былых сл..дах.
...Няхай у сэрцы спе..ць словы,
Як спе..ць яблыкі ў садах.

**Фізкультхвілінка**

2) Ад наступных дзеясловаў утварыце дзеясловы ўмоўнага ладу.

*Узор: памагаць – памог бы*

Любіць -
Майстраваць –
Выхоўваць –
Казаць –
Гучаць –
Клікаць –
Апомніцца –

3) Ад наступных дзеясловаў утварыце формы абвеснага і ўмоўнага ладу. Пастарайцеся выкарыстаць як мага больш форм (па варыянтах).

*Узор: чытаць – чытаю, чытаў, буду чытаць, чытаў бы, чытала б.*

I. Бегчы, мыць, піць, сказаць.
II. Гуляць, ляжаць, глянуць, біць.

4) Выпішыце са сказаў дзеясловы ўмоўнага ладу. Вызначце іх лік, род. Укажыце, ад якіх дзеясловаў утварыліся.

Жоўты лісток з бярозы ляжыць у траве і відаць здалёку. І без яго (не)пахнуў(б,бы) так чабор, не такі прывабны здаваўся(б,бы) і (не)было(б,бы) такой радасці бачыць траву, дрэвы, кусты і высокія хвоі.

5) Выпішыце сказы з дзеясловамі загаднага ладу.

Давайце зірнем на карту. І баран бы касіў, каб хто касу насіў. Шчодра, сонца, над прасторай роднай цеплыні струмень гарачы лі! Кажуць людзі, што птушка не мае клопату. Чужому шчасцю ніколі не зайздросці, умей за сваё змагацца.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія. Выстаўленне і каменціраванне адзнак**

***Метад «Закончы фразу»***

Урок быў карысны, таму што...

Мой настрой быў: а) звычайны; б) вясёлы; в) дрэнны.

На ўроку я зразумеў…